Sputnik Беларусь

26.10.2018

# Павандраваць разам з Саламеяй Пільштыновай можна ў Нацыянальнай бібліятэцы

Иван Руднев



Чытачы змогуць наведаць гарады і краіны, па якіх вандравала першая жанчына-лекарка Рэчы Паспалітай.

Нацыянальная бібліятэка Беларусі распрацавала віртуальны праект "Адысея Саламеі Пясецкай" да 300-годдзя першай у гісторыі Рэчы Паспалітай жынчыны-лекаркі, паведамілі ва ўстанове.

Саламея Рэгіна Русецкая, якая ў замужжы атрымала прозвішча Пільштынова, працавала пры расійскім і аўстрыйскім імператарскім дварах. Яе юбілей уключаны ў Спіс памятных дат ЮНЕСКА на 2018 год.

Праект – гэта віртуальная вандроўка па гарадах і краінах, дзе падарожнічала Русецкая. Сярод іх – Стамбул, Вена, Нясвіж, Санкт-Пецярбург, Кіеў, Рыга і іншыя. Чытачы змогуць натуральна адчуць подых тых часоў – даведацца пра жыццё і традыцыі жыхароў Асманскай імперыі, інтрыгі расійскага двара ў час праўлення імператрыцы Ганны Іаанаўны і паўдзельнічаць у прыгодах гераіні.

Асновай для стварэння віртуальнай вандроўкі сталі мемуары Саламеі – кніга-дзённік "Рэха, на свет пададзенае, заняткаў, падарожжа і жыцця майго авантураў…", якая зараз

знаходзіцца ў Музеі князёў Чартарыйскіх у Кракаве. У Беларусі кніга больш вядомая пад назвай "Авантуры майго жыцця".